


ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ» ВЫБІРАЕ
3

КРОПКІ АПОРЫ АЛЕНЫ СПІРЫДОВІЧ
15



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЛІПЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 128 (28744)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЖАЎНЯК, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Сустрэчы кіраўнікоў усіх узроўняў з працоўнымі калектывамі вельмі важныя: у ходзе іх у людзей ёсць магчымасць данесці праблемы, якія складваюцца на месцах, а ў чыноўніка — пачуць і прыняць правільнае рашэнне, вырашыўшы складанае пытанне. Гэта важны момант у працы з насельніцтвам. Для таго мы і працуем, каб вырашаць праблемы простых людзей».*

## КОРАТКА

- Экспарт беларускай мясной прадукцыі ў студзені — маі вырас амаль на 15 %.
- **У Беларусі рыхтуюцца прапановы па абавязковым прадаўжэнні кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі.**
- Фармзавод у Скідзелі (Гродзенская вобласць) будзе запушчаны ў эксплуатацыю ў кастрычніку. Гэта дазволіць павялічыць рост вытворчасці айчынных дэфіцытных лекаў для ўнутранага рынку і экспарту.
- **Сімвалічную «папараць-кветку» змогуць знайсці гамяльчане на свяце «Купалле» ў Чыгуначным раёне абласнога цэнтра ўвечары.**
- Кампанія Citroën анансавала першыя акуляры ад укачвання — Seetroën, якія ліквідуюць праблему з марской хваробай. У круглай аправе цячэ каляровая вадкасць, якая дапамагае нівеліраваць укалыханне: вочы будуць бачыць гарызантальную лінію. Цана акуляраў у інтэрнэце — 99 еўра.



# ПОЛАЦК З ВЫШЫНІ ПАЛЁТУ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Маладая сям'я з Наваполацка Андрэй і Вольга Зубкі любяць вандраваць і занатоўваць свае ўражанні ў відэаблогу. На іхняй відэастаронцы ў сецiве мільён праглядаў, чатыры тысячы падпісчыкаў. А пачыналася з таго, як Вольга, працуючы ў цырульні, апублікавала матэрыял «зрабі сабе прычоску». Прагляд быў на сотні і тысячы. Потым Андрэй і Вольга сталі здымаць нашыя абласныя цэнтры — архітэктуру, людзей, цяпер прыехалі ў суседні Полацк, каб зверху зняць старажытны горад. Нядаўна яны набылі квадракоптар і асвойваюць гэты від фота і відэа.**

**— Наша захапленне ўмацоўвае нашу сям'ю, — кажуць навапалачане.**

**Дарэчы, пасля нараджэння ў сям'і двойні ў Андрэя і Вольгі захапленне блогерствам і відэаздымкамі стала яшчэ больш натхнёным.**

**Гэта фота было зроблена на фоне славутай полацкай Сафіі.**

# «ЗАРАЗ УСЕ РУСАЛКІ ПЕРАВЯЛІСЯ»,

## або Дзе захаваліся сапраўдныя цуды?

**Чытачы, даўно знаёмыя са «Звяздой», памятаюць, як у 90-я газета пісала пра НЛА, а на пачатку нулявых у ёй была нават містычная рубрыка «777». У сакавіку 1990-га рэдакцыя атрымала цэлы шэраг пісем ад чытачоў пра пралёт агнявых шароў, а таксама чырвоных квадратаў у раёне Мастоў. Апошнім часам такіх навін стала менш. У чым жа справа і ці не зніклі цуды з Беларусі, мы спыталі ў Ільі БУТАВА, каардынатара суполкі «Уфакам» (ufo-com.net).**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ПАЛЕСКІЯ ЦІКАВОСТКІ

***— Кожны сезон вы накіроўваецеся ў розныя экспедыцыі. Чым сёлетні для вас адметны?***

— Ён прысвечаны двум асноўным напрамкам. Яны стартавалі ў канцы мінулага года і плаўна перацяклі ў 2018-ы. Першы напрамак я развіваю асабіста — гэта тэма цудаў. Адсочваю заканамернасці з'яўлення цудаў на тэрыторыі Беларусі. Гэтаму паклала пачатак мая кніжка, якая выйшла зімой, — «Арэал цудаў». Падчас напісання выявіліся раёны, дзе цудаў непараўнальна, я нават сказаў бы, што ў дзесяткі разоў больш, чым у іншых пунктах. І вось зараз, валодаючы гэтай інфармацыяй, мы ездзім у канкрэтныя месцы. Рухаючыся па распрацаваным загадзя маршруце, мы адсочваем і фіксуем незвычайныя з'явы. У нашых планах — далейшае развіццё гэтай тэмы і абагульненне ў межах краіны. Ужо прайшлі экспедыцыі ў некалькіх раёнах — Вілейскім, Уздзенскім, Капыльскім, Валожынскім...

СТАР. 13

■ Кар'ера

# ХТО НЕ РЫЗЫКУЕ, ТОЙ НЕ НАЧАЛЬНІК

## Што перашкаджае жанчынам быць кіраўнікамі

**У беларускіх банках суадносіны супрацоўнікаў — жанчын і мужчын — прыкладна 80 на 20. Але старшынямі праўлення з'яўляюцца пераважна прадстаўнікі дужага полу. Чаму? Як заўважаюць эксперты, прабівацца на вядучыя пасады спадарыням складана не толькі з-за стэрэатыпаў у грамадстве і двайной, з улікам хатніх спраў, нагрузкі.**

З праблемамі ў прасоўванні па кар'ернай лесвіцы сутыкаюцца жанчыны ў розных краінах. Сара Кілінг, кіруючы дырэктар міжнароднай кампаніі BRG, 23 гады працавала ў дзяржаўным сектары і адзначае, што прадстаўніц прыгожага полу ў кіраўніцтве насамрэч мала.

— У сярэднім звяне іх 40 працэнтаў, а на вядучых пасадах — 10, — падзялілася яна назіраннямі падчас форуму Feminominal, які праходзіў у Мінску. — Калі пачынала працаваць, даводзілася падстройвацца пад мужчын. Але жанчыны здольныя прыўнесці іншы падыход у работу.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X